Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# Калгаснік Копыльшчыны

№ 21 (1774) ПЯТНИЦА 12 МАЯ 1944 г.

Орган Копыльскага РК КП(б) Беларусі.

**Смерць нямецким акупантам!**

Справа цяпер заключаецца у тым каб ачысціць ад фашысцких захопникау УСЮ нашу зямлю и аднавиць дзяржауныя границы Савецкага Саюза ПА УСЕЙ ЛИНИИ, ад Чорнага мора да Баранцава мора.

(З загада Вярхоунага Галоунакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша И. Сталина).

4)

# ДАПАМОЖАМ ЧЫРВОНАЙ АРМИИ ДАБИЦЬ ФАШЫСЦКАГА ЗВЕРА!

Па усёй Совецкай краине разнеслися ясныя и мудрыя словы першамайскага загада таварыша Сталина аб бліскучых перамогах Чырвонай Армии и поспехах усяго совецкага народа у барацьбе супроць нямецка-фашысцких захопникау.

Чырвоная Армия у сваим пераможным наступе прайшла з баями ад Волги да Серэта, ад прадгор'яу Каухаза да Карпат, знишчаючы фашысцкую нечысць и вымятаючы яе з совецкай зямли. Совецкия войски вышли на нашы дзяржауныя граници на працягу больш 400 клм., вызвалиушы ад захопникау звыш $^3/_4$ акупиравнай совецкай зямли. 9 мая воины Чырвонай Армии, авалодаушы крэпасцю Севастопаль, поунасцю вызвалили ад нямецких гадау Совецки Крым.

Поспехи Чырвонай Армии стали магчымы дзякуючы правильнай стратэгии и тактыцы совецкага камандавання, дзякуючы высокаму маральнаму духу и наступальнаму парыву нашых войск, узброеных навейшай совецкай ваеннай тэхникай.

Поспехам Чырвонай Армии у значнай меры садзейничали нашы вяликия амерыканския и английския саюзники.

Высока ацанию таварыш Сталин работу совецкага тылу, яки забяспечвае Чырвоную Армию усим неабходным.

Увесь совецки народ праисполнен рашучасци ускорыць разгром ворага и поунасцю аднавиць разбураную ворагам гаспадарку.

Сакрушальныя удары Чырвонай Армии пaставили гитлераускую Германию и перад бойвицки блок на край пропасци. Страх агарнуу финских, румынских, венгерских и балгарских „саюзникау" Гитлера, яких можа выратаваць тольки адно—разрыу з Германией и выхад з вайны.

Таварыш Сталин у сваим загадзе указвае, што совецкаму народу и Чырвонай Армии неабходна „...ачысциць ад фашысцких захопникау УСЮ нашу зямлю и аднавиць дзяржауныя границы Совецкага Саюза ПА УСЕЙ ЛИНИИ, ад Чорнага мора да Баранцава мора".

Загад таварыша Сталина—загад Радзимы. И ён будзе выканан. Парукай таму—высоки патрыятызм совецких людзей, мудрае кирауництва большэвицкай партыи и вяликага Сталина.

Нашы задачы не могуць абмежавацца тольки ачышчэннем усёй совецкай зямли ад ворага. Фашысцки звер цяжка ранен и адпаузае у сваю бярлогу. Яго патрэбна праследаваць па пятах и дабиць у яго уласнай бярлозе—Германии, „шляхам сумесных ударау з Усходу—силами нашых войск и з Заходу—силами войск нашых саюзникау" (И. Сталин). И гэта настане у самым хутким часе.

Першамайски загад правадыра натхняе нас, беларуских партызан, и увесь народ на новыя подвиги. Сваёй няспыннай барацьбой супроць ворага дапаможам Чырвонай Армии дабиць раненага фашысцкага звера!

# НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У Крыму нашы войски, пры падтрымцы масираваных ударау авиацыи и магутнага агня артылерыи, 7 мая пачали штурм вельми умацаваных пазицый нямецка-фашысцких войск, якия абаранялі Севастопаль. За два дни жорстких баёу нашы войски зламали супрациуленне працивника и на усим працягу прарвали асноуную паласу Севастопальскага умацаванага раёна з моцна развитой системай жалезабетонных збудаванняу.

На працягу 9 мая у Крыму войски 4-га Украинскага фронта пры падтрымцы масираваных ударау авияцыи и артылерыи працягвали наступальныя баи супроць нямецка-фашысцких войск у раёне Севастопаля и, зламаушы упорнае супрациуленне працивника, ноччу штурмам авалодали крэпасцю и важнейшай ваенна-марской базай на Чорным моры—горадам Севастопаль.

Тым самым ликвидаван апошни ачаг супрациулення немцау у Крыму, и Крым поунасцю ачышчан ад нямецка-фашысцких захопникау.

На працягу 11 мая на плацдарме правага берага раки Днестр, на пауночны захад ад горада Тираспаль, нашы войски адбивали атаки буйных сил пяхоты и танкау працивника и нанесли яму вяликия страты у жывой силе и тэхницы.

На других участках фронта—без истотных змен.

На працягу з 3 па 10 мая нашы войски на усих франтах падбили и знишчыли 222 нямецкия танки. У паветраных баях, агнём зенитнай артылерыи и на аэрадромах знишчана 364 самалёты працивника.

## Салют Радзимы

10 Мая, у 1 гадзину, сталица нашай Радзимы Масква ад имени Радзимы салютавала доблесным войскам 4-га Украинскага фронта, авалодаушым горадам Севастопаль,—24 артылерыйскими залпами з 324 гармат,

## Адзинае жаданне

Устанавилася поуная цишына. Тольки лес шумеу, як и заусёды, хвои урачыста пакачвали свяими вяршынами, быццам бы и яны витали першамай.

И вось раздауся цвёрды и громки голас камандзира брыгады Никалая Ш.

—Загад Вярхоунага Галоунакамандуючага, — прачытау камбрыг, и рэха далёка панесла сталинския словы.

Як вылитыя, стаяли стройныя рады народных мсциуцау.

—Партызаны и партызанки!— гэтыя словы правадыра адносилися к им, их таварыш Сталин витае першыми пасля воинау Чырвонай Армии.

Затаиушы дыханне, слухали байцы и камандзиры загад правадыра. Сюды, у глыбоки тыл ворага, далятаюць сталинския словы и западаюць у сэрцы партызан.

Совецким людзям мудрыя сталинския словы прыдаюць силы у барацьбе з заклятым ворагам. Пасля загада Вярхоунага Галоунакамандуючага кожным партызанам авалодала адзинае жаданне—дапамагчы Чырвонай Армии дабиць раненага фашысцкага звера! Аб гэтым гаварыли у сваих выступленнях и палитрук Никалай К., и байцы Феликс Р., Никалай Ф. и другия.

**И. Падгорны.**

## Павяличваюць баявы рахунак

Партызаны атрада имени Д., натхвёныя першамайским загадам Вярхоунага Галоунакамандуючага таварыша Сталина, павяличваюць свой баявы рахунак.

Група партызан (старшы Валодзя С.) на дарозе Быстрыца—Тимкавичы падарвала на мине аутамашыну працуника, прычым были ранены 3 немцы. 2-х фрыцау партызаны гэтай групы забили у раёне вёски К.

Другая група на чале з таварышам Б. на дарозе Стоубцы—Пагарэлае падарвала грузавую нямецкую аутамашыну. У вынику узрыву налажыли галовы 3 фрыцы.

**Н. Падарожны.**

## Пачуццё сялян

Ва усе населеныя пункты раёна дайшоу першамайски загад Вярхоунага Галоунакамандуючага таварыша Сталина. У многих вёсках адбылися митынги, на яких партызанския агитатары зачытвали загад правадыра.

Простыя и мудрыя сталинския словы дайходзяць да сэрца кожнага селянина. Вера у хуткае вызваленне ад нямецка-фашысцких захопникау, гатоунасць усими сродками дапамагчы Чырвонай Армии и партызанам у ихняй барацьбе з заклятым ворагам—такое пачуццё у сялян вызвау сталински загад.

**Василь Е.**

## Немцы рыхтуюць новую правакацыю

Каб знишчыць наш народ, немцы имкнуцца знишчыць спачатку яго цвет—моладзь. Для ажыццяулення гэтага крывавага плана яны скарыстоуваюць усе сродки — масавыя расстрэлы, угон у Германию и г. д.

Па павестках-жа к гитлерауцам нихто не з'яуляецца, а палавиць усих па адзиночку яны не у силах. Пагэтаму немцы рыхтуюць новую правакацыю. У Копыли и других гарнизонах и вёсках яны булуць арганизоуваць вечарынки, каб сабраць туды юнакоу и дзяучат, а затым пахватаць их и адправиць у Германию.

Юнаки и дзяучаты! Мы вас папярэджваем, не идзице на гэтыя вечарынки, не паддавайцеся ни на якия правакацыи гитлерауцау, каб не папасци на катаргу у Германию!

Помниче, што скора прыдзе Чырвоная Армия, пагэтаму усими сродками ухиляйцеся ад нямецкай мабилизацыи, рыхтуйцеся к сустрэчы нашых вызвалицеляу-совецких воинау.

## Адпомсцим нямецким звяругам!

Свет яшчэ не бачыу таких извергау, як гитлерауския бандыты. Нядауна яны закляймили сябе яшчэ адным нечуваным злачынствам.

У вёсцы Савичы фрыцы упрэгли у борану трох дзяучат и гаяли их па поли, пакуль яны не страцили прытомнасци.

Забиць чалавека—гэта для немца вяликая радасць. Але проста забиць—гэта яму яшчэ мала. Немцу хочацца замучыць чалавека и пацешыцца над яго прадсмертными пакутами.

Адпомсцим-жа нямецким звяругам за ихния здзеки над няшчасными и нявиннами дзяучатами.

**Н. Д.**

## Трэци ваенны заём

З вяликим патрыятычным уздымам працоуныя Совецкага Саюза падписваюцца на выпушчаны 5 мая г. г. 3-ци дзяржауны ваенны заём. Намечаная сума падписки 25 мильярдау руб. ужо была перавышана 6 мая на 213 мильёнау руб.

Горача адгукнулися на падписку працоуныя вызваленых раёнау Беларуси. Так, у першы дзень падписки на заём жыхары Мазыря падписалися на 400.000 руб. Сума падписки у Нова-Белицы к 7 мая дасягнула 1.270.000 руб.

## Мижнародная хроника

◆◆ У 1943 годзе ЗША и Брытанская империя выпускали у сярэдним за 1 гадзину 14,5 камплектных самалётау, 9 гармат, амаль 106 тысяч снарадау и прыкладна 3 мильёны патронау.

◆■ Не менш 100 тысяч жыхароу Бельгии удзельничае у падпольнай барацьбе супроць акупантау. На прадпрыемствах, якия працуюць на немцау, шырокия размеры набывае сабатаж и дыверсии. У Бельгии выходзиць каля 20 падпольных газет.

**РЭДКАЛЕГИЯ**